Выпуск №176 (февраль, 2025)

# Большая перемена




Издается с декабря 2005 года

*Газета Государственного учреждения образования «Средняя школа №2 г. Калинковичи»*




*Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю.*

**Я.Колас**

## В ЭТОМ ВЫПУСКЕ

"Не пакідайце ж мовы нашай беларускай..." Працяг ........ 2

Мова – тое, што нас аб'ядноўвае ........ 2

Дети войны: истории героев ........ 3

Статен в строю – силен в бою ........ 3

Развітанне з зімой ........ 4

Турнир «Фавор» ........ 4

Цитаты известных людей ........ 4

# «НЕ ПАКІДАЙЦЕ Ж МОВЫ НАШАЙ БЕЛАРУСКАЙ...»

***26 гадоў запар мы адзначаем Сусветны дзень роднай мовы. Балюча ўсведамляць, што мы гаворым пра родную мову раз на год. І то пра мову, а не на мове. А чаму не гаворым на ёй кожны дзень? Што нам перашкаджае?***

Нікога даўно не здзіўляе той факт, што мы, беларусы, амаль не гаворым на сваёй мове. Яе, як рарытэт, паклалі на паліцы разам са слуцкімі паясамі і дастаём толькі на вялікія святы.

А што такое мова? З аднаго боку – гэта сродак зносін, з другога – прыкмета ідэнтычнасці і самабытнасці народнасці. Мова яднае нас у народ, які носіць прыгожае імя – беларусы. Для нашага народа родная мова – беларуская. Яна з'яўляецца каштоўным дыяментам сярод незлічы моў свету, якую лічаць адной з найпрыгажэйшых у свеце. Яна сучасная і развітая, на ёй лёгка выказаць свае думкі і пачуцці. І пры гэтым усім яна вельмі мілагучная...

У штодзённым жыцці большасць грамадзян гаворыць па-руску, таму што раслі ў рускамоўным асяроддзі і з маленства чулі не родную, а менавіта суседскую мову. Руская мова паўсюдна панавала і пануе сёння ў нашым грамадстве, беларуская знаходзілася і знаходзіцца дзесьці на ўзбочыне і не выкарыстоўваецца сваім жа народам.

Але пры такім становішчы беларускія словы паступова знікнуць, і новыя пакаленні застануцца без унікальнай мовы — сакавітай, багатай, незвычайна пявучай. Адгарніце любы твор беларускага пісьменніка і ўчытайцеся ў словы. Як прыгожа апісваецца прырода Беларусі, як тонка перадаюцца адценні чалавечых пачуццяў. Толькі беларуская мова здольна размежаваць "любовь к девушке" і "любовь к сосискам" з дапамогай розных слоў: каханне і любоў.

І я, дарослы ўжо чалавек, доўга не магла наважыцца размаўляць на роднай мове ў грамадскіх месцах: у магазіне, у транспарце, на працы. Нешта ў сярэдзіне мяне самой увесь час стрымлівала. Можа, ад празмернай увагі людзей. Але ж я здолела перамагчы сябе. І ўсё часцей і часцей кажу на роднай мове. І якая ж рэацыя людзей? У большасці сваёй усміхаюцца, некаторыя кажуць, што прыемна чуць беларускую мову. Праўда, некаторыя перапытваюць. Але гэта, я думаю, ад нечаканасці.

***Працяг на старонцы 2***

# «НЕ ПАКІДАЙЦЕ Ж МОВЫ НАШАЙ БЕЛАРУСКАЙ…»

(ПРАЦЯГ. ПАЧАТАК НА СТАРОНЦЫ 1)

Таму звяртаюся да тых, хто хацеў бы размаўляць на роднай мове, але па нейкіх прычынах не робіць гэтага. Пасля таго, як вы пераадолееце ў сабе гэту няўпэўненасць, вы здзівіцеся, якую асалоду ў выніку атрымаеце, як многа знойдзеце!

А тым, хто ніколі нават не задумваўся, на якой мове яму размаўляць, хачу прыгадаць словы Францішка Багушэвіча: «Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек перад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!»

Кожны чалавек павінны памятаць, што валоданне беларускай мовай – гэта не «неабавязковы дадатак», гэта тое, што ў сукупнасці з нашай культурай і гісторыяй дае нам права звацца беларусамі.




Выстава творчых работ "Ах, якія словы!.."

Зберагчы беларускую мову і пашырыць асяродак яе ўжывання – гэта наш прамы абавязак перад самімі сабой і наступнымі пакаленнямі.

***Макарэвіч Т.П.***

# МОВА – ТОЕ, ШТО НАС АБ’ЯДНОЎВАЕ



***Сёння людзі могуць спытаць: «Чаму трэба берагчы нашу родную мову?" І адказ на гэтае пытанне ёсць. Наша мова вызначае мысленне і погляд на свет, яна галоўны інструмент камунікацыі паміж людзьмі. Мова перадае традыцыі і веды народа, служыць мастом паміж мінулым, сучаснасцю і будучыняй.***

21 лютага – Дзень роднай мовы. І менавіта ў гэты дзень мы аддаём даніну павагі нашым нацыянальным караням. Важна беражліва адносіцца да мовы, захоўваць усё лепшае, што ў ёй ёсць.

«Мова – тое, што нас аб’ядноўвае!» – пад такім дэвізам праўшоў у школе Міжнародны дзень роднай мовы.

Да свята школа была ўпрыгожана. Навучэнцы 5-8 класаў падрыхтавалі выставу творчых работ "Ах, якія словы!..": трэбы было «напісаць» беларускія словы з таго, што яны абазначаюць. І трэба адзначыць, што работы атрымаліся вельмі цікавыя і арыгінальныя. Сцены на другім паверсе былі ўпрыгожаны малюнкамі і насценнымі газетамі, прысвечанымі жыццю і творчасці беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Тут жа, на другім павесрсе, была арганізавна выстава "Беларускія словы ў прадметах і рэчах".

А пачаўся Дзень роднай мовы з таго, што вучаніцы 11 класа Карабін Ангеліна, Кавальская Марыя і Петрушкевіч Анастасія на ўваходзе ў школу віталі дзяцей і настаўнікаў пабеларуску і ўручалі ўсім наклейкі, прысвечаныя роднай мове.



Да спадобы вучням прыйшоўся і музычны перапынак, падчас якога спяваліся беларускія песні ("Купалінка", "Па-над белым пухам вішняў") і выконваліся беларускія танцы (полька, падэспань).

Вучням спадабаліся мерапрыемствы, і яны зарадзіліся добрым настроем на ўвесь дзень.

***Вераніка Каваленка***

# ДЕТИ ВОЙНЫ: ИСТОРИИ ГЕРОЕВ

***В преддверии Дня памяти юного героя-антифашиста, 7 февраля, прошел торжественный пионерский сбор дружины имени Т.И. Брагонина. Пионеры собрались вместе, чтобы вспомнить тех ребят, которые были пионерами во время Великой Отечественной войны.***




Пионеры подготовили небольшую выставку, посвященную Дню памяти: фотографии юных партизан, копии газетных статей о их подвигах, а также рисунки, изображающие события тех страшных лет. Они перечислили имена героев-пионеров: Марата Казея, Зины Портновой, Лёни Голикова, Вали Котика. Каждый пионер знает, что эти ребята, несмотря на свой юный возраст, совершали подвиги, достойные взрослых. В знак глубокого уважения и скорби по тем, кто отдал свои жизни за свободу Родины, ребята почтили их память минутой молчания. Это день, когда вспоминают о тех мальчишках и девчонках, которые, рискуя жизнью, помогали партизанам, распространяли листовки, собирали оружие, ухаживали за ранеными и сражались наравне со взрослыми против фашистских захватчиков.

Ребята узнали о том, как Зина Портнова, будучи связной партизанского отряда, мужественно переносила пытки, но не выдала своих товарищей. Услышали о Лёне Голикове, который подорвал вражескую машину с важными документами, о Марате Казее, который взорвал себя гранатой, чтобы не попасть в руки врага. И, конечно, о Вале Котике, самом юном Герое Советского Союза.

Этот день посвящён этим маленьким героям, которые отдали свои жизни за мир, за то, чтобы будущее поколение жило в свободной и мирной стране. Этот день стал напоминанием о том, что героизм не имеет возраста и каждый может внести свой вклад в защиту мира и справедливости. «»

***Милана Бужан***

СМОТР-КОНКУРС

# СТАТЕН В СТРОЮ – СИЛЕН В БОЮ

***В преддверии Дня защитников Отечества, 22 февраля 2025 года, в спортивном зале ГУО «Средняя школа N2 г. Калинковичи» прошел смотр-конкур строя и песни «Статен в строю – силён в бою».***



Смотр-конкурс начался с торжественного открытия, на котором с приветственным словом выступил директор школы Мельник Максим Олегович.

Участники продемонстрировали навыки строевой подготовки, исполнение строевых песен и умение четко выполнять команды.

Жюри оценивало не только точность и синхронность движений, но и внешний вид, дисциплину и сплоченность команд.

По итогам конкурса команды, занявшие призовые места, были награждены грамотами.

I место – заняла команда 9 «Б», II – 6 «А», III – 5 «А».

***Вероника Коваленко***

Тираж 30 экземпляров



**ГУО «Средняя школа №2
г. Калинкодинства вичи»**

Адрес школы: 247710,
г. Калинковичи
Гомельской области,
ул. Пионерская, 27 Б

Телефон: 2 - 38 - 84

Email:
guo.sosh2@kalinkovichi.gov.by

http://k-soch-2.schools.by

Учредители:
Администрация
ГУО «Средняя школа №2
г. Калинковичи»,
Совет Школы

**Мы вместе!**

## ЦИТАТЫ ИЗВЕСТНЫХ ЛЮДЕЙ

***Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў.***

**Уладзімір Караткевіч**

* * *

*Хто не паважае родную мову, не паважае родны народ.*

**Іван Мележ**

* * *

***Я – беларус, мая родная мова – беларуская.***

**Васіль Быкаў**

* * *

*Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову.*

**Якуб Колас**

* * *

***Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам.***

**Янка Сіпакоў**

ШЫРОКАЯ МАСЛЕНІЦА

# РАЗВІТАННЕ З ЗІМОЙ

***У канцы зімы (а ў гэтым годзе 1 сакавіка) у Калінкавічах па традыцыі адсвяткавалі Масленіцу. Гэта свята ў народным календары займае асобнае месца. Нашы продкі ўспрымалі яго як пачатак новага жыцця і ўшаноўвалі сонца, што абуджае ўсё жывое. Масленіца – традыцыйнае свята нашага народа, неад'емная частка яго культуры.***




Развітанне з зімой і прывітанне вясны перавандравалі з язычніцтва ў хрысціянства даўным-даўно, але атрыбутыку сваю свята да нашых дзён захавала. А з ёй і традыцыю: спаліць пудзіла, каб расстацца з халадамі і паскорыць прыход цёплых дзён. І бліны як пяклі нашы продкі ў старажытнасці, так і мы следам за імі звычай гэты з задавальненнем паўтараем. Калінкавічане гісторыю роднай Беларусі берагуць, а таму да народных свят ставяцца з душой.

Вось і ў суботу, 1 сакавіка, вучні і настаўнікі нашай школы з задавальненнем паўдзельнічалі ў "Масленічнай ярмарцы", падчас якой была наладжана вытава дэкаратыўна-прыкладной творчасці з удзелам скамарохаў і карабейнікаў. Жыхарам горада былі прапанаваны бліны з варэннем, з мёдам, а самае галоўнае – вясёлы настрой.

Дзякуючы гэтаму святу, вучні нашай школы па-іншаму вучацца глядзець на народныя традыцыі і абрады. Прымаючы ўдзел у святах, мы ў які ўжо раз упэўніваемся, што наша краіна вельмі багатая на культурную спадчыну.

***Кацярына Бічан***

# ТУРНИР «ФАВОР»

***1 марта на базе ГУО «Средняя школа №2 г. Калинковичи» состоялся турнир по интеллектуальным играм «Фавор».***



Интеллектуальный турнир стал для ребят возможностью не только проявить свои знания, но и развить критическое мышление, навыки командной работы и межличностные коммуникации.

Нашу школу представили учащиеся 8-10 классов: Науменко Николай, Башак Владислав, Александров Владислав, Скляр Алексей, Пархимович Анастасия.

Поздравляем ребят с дипломом III степени.

***Редколлегия***

Ответственный за выпуск Макаревич Т.П.